СУСТРЭЧЫ




# ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**20 студзеня ў кніжнай краме «Книжный мир» горада Ліда аматараў літаратуры ў чарговы раз сабрала літаратурная гасцёўня «Выхад у свет». У сустрэчы калег і сяброў-аднадумцаў прынялі ўдзел госці з Гродна.**

Мінулы 2023 год прынёс літаратарам Ліды і Лідскага раёна сур'ёзнае выпрабаванне, – у снежні не стала кіраўніка Лідскага раённага літаратурнага аб'яднання «Суквецце», беларускага паэта, журналіста Алеся Мацулевіча. Але нягледзячы на трагічную падзею, літаратурнае жыццё ў рэгіёне працягваецца. Справа Алеся жыве. Гэты таленавіты, светлы чалавек не толькі пакінуў пасля сябе добрую памяць, але і за сваё кароткае жыццё з дапамогай сваіх аднадумцаў здолеў стварыць сапраўдную літаратурную супольнасць, якая сёння працягвае жыць паўнавартасным жыццём і пускаць парасткі на блаславёнай Лідскай зямлі.

Студзеньскае пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» пачалося з ушанавання памяці лідскага літаратара Алеся Мацулевіча. Ініцыятарамі праекта з’яўляюцца вядомыя паэты Руслан і Святлана Піваваравы. Гасцёўня штомесяц аб'ядноўвае пісьменнікаў, аматараў літаратуры, захопленых мастацтвам лідчан. Тут абмяркоўваюць важныя літаратурныя падзеі, адзначаюць юбілеі класікаў, прэзентуюць кніжныя навінкі, дзеляцца навінамі з творчага і грамадскага жыцця. Натхнёныя ідэяй мастацтва, людзі саграваюць адзін аднаго душэўным цяплом. Асноўная асаблівасць камерных сустрэч у царстве кніг – унікальная па добразычлівасці сяброўская атмасфера жыццялюбства, пазітыву і аптымізму. Па традыцыі выступіць у галоўнай кніжнай краме другога па велічыні горада вобласці прыязджаюць гродзенскія калегі. Як прызнаецца гродзенскі «рэзідэнт» лідскага літаратурнага салона, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык, мы стараемся паказваць у Лідзе новых, малавядомых аўтараў, адкрываць новыя імёны. Нагадаем, што крама «Книжный мир» у горадзе Ліда з'яўляецца адзінай гандлёвай кропкай Гродзенскай вобласці, якая прадастаўляе на сваёй тэрыторыі пляцоўку для літаратурных мерапрыемстваў (напрыклад, у Мінску



аналагічнымі спецыялізаванымі лакацыямі сталі кнігарні «Светач» і «Акадэмкніга). Захапляе сваёй універсальнай шматзначнасцю назва гасцёўні. Выхадам у свет можна назваць і выданне новай кнігі, і культпаход. Апошняя акалічнасць падкрэслівае адкрыты характар праекта, разлічанага на ўсіх людзей добрай волі, якія імкнуцца ўзбагаціць свой вольны час далучэннем да культурнага жыцця, неад'емнай часткай якога з'яўляецца мастацкая літаратура.

Гэтым разам, акрамя прадстаўніка СПБ, гасцямі лідскай літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» сталі калегі з абласнога цэнтра: беларускі празаік Ірына Салата і дзіцячая пісьменніца Эла Едэшка.




Ірына Аркадзьеўна Салата *(на фота)* стараецца прымаць удзел ва ўсіх мерапрыемствах Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, выступае не толькі ў Гродне, але і ў раёнах. Ветэран педагагічнай працы, на працягу амаль паўстагоддзя вучыць гродзенскіх школьнікаў беларускай мове і літаратуры. Выпусціла ўжо 6 кніг, разлічаных на дарослую і дзіцячую чытацкую аўдыторыю. Абрала для распрацоўкі жанравую форму празаічнай мініяцюры. Называе свае творы пейзажнымі замалёўкамі. Уласцівыя іх гучанню яркая вобразнасць і эмацыйная глыбіня спрыяюць філасофскаму пераасэнсаванню рэчаіснасці, развагам аб існым і вечным; абуджаюць любоў да прыроды роднага краю, часткай якой з'яўляецца чалавек. Як шчаслівая, кахаючая бабуля стала шмат пісаць і для дзяцей. Свет яе фантазій – гэта чароўны казачны свет, дзе гарманічна і павучальна для маленькіх чытачоў ўзаемадзейнічаюць фальклорныя матывы, фантастычныя вобразы лялек, цацак і іншых жыхароў планеты Дзяцінства. На сваіх сустрэчах з чытачамі пісьменніца звычайна знаёміць не толькі з аўтарскімі кнігамі і творамі, але і з іх героямі – лялькамі і цацкамі; быццам заклікае азірнуцца на гэты шчаслівы час у пачатку жыццёвага шляху і прапануе хоць часова скінуць з сябе груз праблем і клопатаў і вярнуцца ў казку дзяцінства, дзе ўсё і ўсе значна прасцей, весялей і дабрэй, чым у сур'ёзным і не заўсёды гарманічным свеце дарослых.



Эла Едэшка *(на здымку)* піша на рускай мове, з'яўляецца аўтарам зборніка апавяданняў для дзяцей «Давай начнём, а там придумаем», сваёй дэбютнай кнігі, якая ў чэрвені мінулага, 2023 года выйшла ў расійскім выдавецтве «Стрекоза». З сваім першым выданнем прыняла ўдзел у галоўнай падзеі літаратурнага жыцця Расіі – Міжнародным кніжным фестывалі «Красная площадь» (Масква, 2-6 чэрвеня 2023 года). У снежні Эла Еўстафьеўна прэзентавала сваю кнігу маленькім аматарам чытання ў дзіцячым філіяле Гродзенскай абласной бібліятэкі. Сюжэты апавяданняў са зборніка – гэта вясёлыя, займальныя гісторыі з жыцця дзяцей, напоўненыя шчырай цеплынёй і тонкім, добрым гумарам. Чытаць іх цікава і дарослым, бо ўсе мы калісьці былі дзецьмі. А заадно можна параўнаць наша дзяцінства і сучаснае. Пісьменніца – чалавек шматгранны, з вялікай колькасцю творчых захапленняў. Акрамя літаратурнай творчасці, Эла займаецца жывапісам, скульптурай, яна народны майстар-рамеснік. Актыўна прадстаўляе сябе ў інтэрнэт-прасторы. Што немалаважна, пісьменніца валодае мноствам кампетэнцый па кнігавыдавецкай справе і супрацоўніцтве з расійскімі выдавецтвамі (у асноўным арыентаванымі на літаратуру для дзяцей), чым гатовая дзяліцца з калегамі. Кожнае яе выступленне – фактычна не толькі прэзентацыя творчасці, але і змястоўны майстар-клас на тэму «Як стаць паспяховым пісьменнікам». Часцей за ўсё ў нашым выпадку паняцце «паспяховы пісьменнік» – гэта аўтар, які выдае кнігі не за свой кошт.

Далей у мерапрыемстве выступілі лідскія літаратары. Сярод іх пераважаюць паэты. У кожнага свой уласны аўтарскі почырк, свае падыходы і мастацкія прыёмы. І тэматычная палітра таксама свая. Валерый Мацулевіч зачытаў пранікнёны рэквіем памяці брата, паэта Алеся Мацулевіча. З дэкламацыяй аўтарскай лірыкі розных гадоў таксама выступілі Людміла Русь, Алена Несцерава, Алег Дабрыян, Тэрэза Смольская, Уладзімір Дронаў, Святлана Піваварава, Руслан Піваварaў, Ігар Вербавік. Вельмі прыязнай, хвалебнай рэфлексіяй на выступленне гасцей адгукнулася педагог Вольга Высоцкая. Кожны жадаючы мог набыць кнігі гасцей з аўтарскімі аўтографамі на памяць. З вялікай удзячнасцю арганізатарам і наведвальнікам літаратурнага салона ў лідскай кнігарні «Книжный мир» (дырэктар Галіна Аляксандраўна Станевіч) мы развіталіся з горадам Ліда, дзе нягледзячы на снежнае надвор'е, атрымалі асалоду ад цёплага сяброўскага прыёму і будзем чакаць новых цікавых і прыемных сустрэч.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
Гродзенскае абласное аддзяленне

*Фота*
*Дзмітрыя Радзівончыка,*
*Руслана Піваварава*
*і Святланы Піваваравай*


Замежная
літаратура
Давай начнём
Дым без огня


Давай начнём
Дым без огня





Выступае Ірына Салата (Гродна)




100 ГОЛОСОВ


ДАВАЙ НАЧНЁМ
ДЫМ БЕЗ ОГНЯ







Выступае Эла Едэшка (Гродна)









Паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык (Гродна)



Людміла Русь



Алег Дабрыян




Валерый Мацулевіч



Алена Несцерава



Святлана Піваварава



Уладзімір Дронаў




Тэрэза Смольская



Ігар Вербавік




Вольга Высоцкая









У цэнтры – арганізатар і вядучы пасяджэнняў літаратурнай гасцёўні
«Выхад у свет», паэт Руслан Піваварaў (Ліда)

